Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРА-МЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ

Адрас рэдакцыі: Менск, р. Карла Маркса і Чырвонаармейскай, 48, Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР.

№ 11 (145)	11—20 красавіка	1934 г.

ЗМЕСТ

Агляд надвор'я за дэкаду з 11-га па 20/IV 1934 г.

Гэтая дэкада характэрна хуткімі зменамі розных паветраных мас і барычных вобласцей, якія рухаліся з паўночнага захада на паўднёвы ўсход, пасгупова займалі тэрыторыю БССР і рэзка мянялі надвор'е.

У першыя дні дэкады назіралася наступнае размеркаванне барычных вобласцей: цыкланічная дзейнасць, якая пачынаецца на Атлантычным акіяне, працягваецца праз Англію, заходнюю Еўропу, БССР і ідзе далей на паўночны ўсход праз Совецкі сајуз у напрамку на Барэнцава мора.

Над Ісляндыяй знаходзіцца вобласць высокага ціску ў масах халоднага морскага арктычнага паветра. Грэбень высокага ціску гэтага антыцыклона працягваўся праз Скандынавію на Прыбалтыку, і аж да паўночнай часткі БССР. 14-га красавіка тэрыторыя БССР знаходзілася цалкам пад уплывам гэтага высокага ціску, які ўтрымліваецца на нашай тэрыторыі да 16 красавіка ўключна.

Табліца вынікаў метэаралагічных

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра: 11	12	13	14	15	16	17	18	19	20		Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі нагляд. мінімум
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	0	2	1	3	4	9	11	9	11	11	—	6	—	18	—4	15
	3	Полацак	1	2	2	3	4	8	11	10	11	10	—	6	5	18	—3	14
		Вялікія-Лукі	0	1	1	2	3	6	10	9	9	10	—	5	—	18	—3	14
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	1	2	2	—	—	—	—	—	—	—	—	5	4	17	—3	14
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	1	2	1	3	4	7	11	10	14	10	—	6	—	21	—2	14
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	2	3	1	3	5	6	11	11	15	9	—	7	5	24	—3	15
	16	Менск.	2	3	0	2	4	8	11	12	15	9	—	7	6	24	—4	14
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар‘іна-Горка	3	3	1	2	4	8	11	12	15	9	—	7	6	23	—2	14
	25	Асіпавічы	6	4	2	3	5	8	12	12	16	10	—	8	6	25	—4	15
	10	Орша	2	2	1	2	4	6	9	10	12	8	—	6	5	20	—2	15
	19	Горкі	3	3	1	2	4	6	8	10	12	10	—	6	5	19	—3	15
III. Цэнтральны (раўніны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	5	3	1	3	5	8	11	13	16	10	—	8	—	23	—2	14
	30	Мар.-Сосны	8	4	2	2	4	7	10	13	17	11	—	8	7	24	—3	15
	21	Магілеў	5	4	2	3	4	6	10	10	13	12	—	6	5	22	—3	14
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	7	6	1	2	4	6	9	10	14	12	—	7	5	20	—2	14
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	8	6	2	3	5	6	9	11	14	12	—	8	6	22	—2	14
	32	Жлобін	10	6	2	3	5	7	11	12	14	12	—	8	6	23	—2	14
IV. Паўднёвы (нізіны)	33	Жыткавічы	10	5	2	3	4	7	11	15	17	13	—	9	7	25	—3	15
	37	Калінкавічы	13	6	3	3	4	6	12	14	17	12	—	9	7	24	—4	15
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	14	7	2	3	5	6	10	13	17	15	—	9	6	23	—2	14
	35	Васілевічы	14	6	3	3	5	7	11	13	17	12	—	9	7	23	—2	14
	40	Людвінава	14	8	4	3	6	8	11	14	17	16	—	10	7	—	—1	14

назіран няўза 11—20 красавіка 1934 г.

Алносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы: Максімал.	Мінімальн.	Чысло, калі нагляд. мінімум	Ападкі ў мм: 11	12	13	14	15	16	17	18	19	20		Сума	Метэаралагічная з'ява (у дужках адзначаны числы)
49	—	—	—	..	..	0.5	0.5	..	..	..	5.0	1.0	0.5	—	7.5	граза (19)
56	—	—3	—	4.0	0.5	0.4	..	..	0.5	..	..	5.0	0.4	—	10.8	туман (12), граза (19)
55	25	—	14	1.0	2.0	..	..	..	0.3	..	..	3.0	..	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	6.3	—
59	33	—6	15	9.0	..	1.0	..	..	0.1	..	..	10.0	0.5	—	20.6	граза (11, 19)
54	—	—	—	9.0	0.1	..	..	..	0.3	..	..	3.0	1.0	—	13.3	граза (20)
—	—	—	—	9.0	..	0.2	..	..	0.1	..	..	3.0	1.0	—	13.3	граза (19)
—	—	—	—	17.0	3.0	0.3	..	..	0.1	..	0.1	3.0	3.0	—	26.5	—
63	—	—	—	15.0	..	..	..	..	..	..	..	0.6	5.0	—	20.6	туман (13, 16), граза (19)
58	32	—7	14	22.0	..	0.1	..	..	..	0.1	..	0.2	1.0	—	23.4	туман (12), граза (11)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
61	26	—2	14	15.0	..	..	0.1	..	..	..	..	0.5	10.0	—	25.6	туман (12), граза (19)
54	—	—	—	2.0	..	..	..	..	..	..	..	13.0	0.2	—	15.2	туман (12), град (19)
54	—	—4	16	7.0	..	0.1	..	..	..	..	..	8.0	5.0	—	20.1	граза (12)
63	25	—3	14	5.0	0.2	0.5	..	..	..	..	..	9.0	0.5	—	15.2	граза (19)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
71	—	—4	14	0.1	1.0	..	..	..	..	..	..	4.0	8.0	—	13.1	граза (19), туман (11, 12)
59	—	—5	15	10.0	..	..	0.1	0.1	..	0.1	..	24.0	1.0	—	35.3	туман (11), граза (19)
56	—	—	—	1.0	1.0	..	..	..	..	..	..	19.0	4.0	—	25.0	граза (19), туман (20)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
56	—	—	—	3.0	..	0.3	..	..	..	..	..	4.0	3.0	—	10 3	граза (19), туман (12)
—	—	—	—	0.1	..	0.3	..	..	0.1	..	..	16.0	14.0	—	30.4	граза (20)
58	32	—4	16	5.0	..	..	..	..	..	..	..	8.0	1.0	—	14.0	граза (19)
57	—	—	—	7.0	..	0.1	..	..	..	..	..	5.0	0.1	—	12.2	—
65	—	—	—	7.0	..	..	0.1	..	..	0.1	..	8.0	4.0	—	19.2	туман (20), граза (19)
66	—	—	—	..	..	..	..	..	..	..	..	2.0	5.0	—	7.2	туман (20), граза (19)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	3.0	0.1	0.2	..	..	..	..	..	7.0	7.0	—	17.3	граза (15)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
19	—	—	—	0.3	0.4	0.1	..	..	..	..	..	5.0	12.0	—	17.8	туман (11), граза (19)
48	—	—3	14	..	..	..	..	..	..	..	..	3.0	7.0	—	10.0	туман (11, 19)
49	38	—2	17	3.0	3.0	..	0.1	0.1	..	..	..	0.1	6.0	—	12.3	туман (16), граза (20)

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў за 11—20 красавіка 1934 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхховага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	SW	4	W	10	—	6	6	вільготная
	3	Полацак	NW	4	NW	7	—	6	6	"
	—	Вялікія Лукі	NW	4	S	10	—	6	3	"
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	SE	4	N	7	40	6	6	вільготная
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	N	4	NW	12	—	6	6	вільготная
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	"
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	N	4	NW	16	—	6	6	вільготная
	16	Менск	NW	2	NW	12	—	6	6	"
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	NW	2	SW	12	—	6	3	вільготная
	25	Асіпавічы	NW	4	NW	12	—	6	6	"
	10	Орша	N	2	N	10	—	6	3	мокрая
	19	Горкі	NW	4	NW	10	—	8	6	вільготная
III. Цэнтральны (раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	NW	4	NW	12	—	6	6	вільготная
	30	Мар'іна-Сосны	E	4	E	12	—	6	6	"
	21	Магілеў	N	4	NE	10	—	6	6	сухая
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	NW	4	NW	14	—	6	6	вільготная
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	"
	31	Турск	NW	4	NW	10	—	6	3	"
	32	Жлобін	NW	4	NW	10	—	6	3	"
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы	NW	2	W	7	—	6	6	вільготная
	37	Калінкавічы	NW	4	NW	15	—	7	3	"
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	вільготная
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	NW	4	NW	12	—	6	6	мокрая
	35	Васілевічы	NW	4	NW	10	52	6	3	вільготная
	40	Людвінава	NW	4	NW	10	—	9	3	сухая

У астатнія дні, да канца дэкады, БССР знаходзілася пад уплывам цыклонаў, якія рухаліся праз Заходнюю Еўропу, Прыбалтыку і БССР і далей на паўночны ўсход.

У першы дзень дэкады тэрыторыю БССР займалі: на поўначы халодныя масы морскага арктычнага паветра, а на поўдні цёплыя масы субтрапічнага паветра, у выніку чаго на поўначы БССР мінімальныя тэмпературы дасягалі—2—4 градусаў, а на поўдні максімальныя тэмпературы былі +19 +20 градусаў. Раздзел, які праходзіць паміж гэтымі масамі, дае пахмурнасць і ападкі. 12-га красавіка, на змену гэтым масам, уваходзіць з захаду морскае палярнае паветра, якое і стварае пахмурнасць і ападкі ўжо па ўсёй тэрыторыі БССР, што і ўтрымліваецца да 13-га красавіка ўключна.

14-га красавіка з паўночнага захаду насоўваюцца халодныя масы морскага арктычнага паветра, якія ўнеслі рэзкую змену ў надвор'е: з пахмурнага і вільготнага—на яснае і сухое, з вельмі невялікаю вільготнасцю паветра (да 30%) і нізкімі тэмпературамі, даходзячымі ў многіх месцах БССР да —3-4 градусаў.

Гэтае халоднае, морскае, арктычнае паветра ўтрымліваецца на нашай тэрыторыі 14-га і 15-га красавіка, а з 16-га красавіка пачынае ператварацца ў кантынентальна-палярнае паветра, якое і ўтрымліваецца на месцы да 18-га красавіка ўключна. Дзякуючы таму, што гэтая халодная маса доўгі тэрмін знаходзіцца на кантыненце, утвараецца яе паступовае праграванне, у выніку чаго тэмпература 18-га красавіка дасягала +21+22 градусаў.

19-га красавіка тэрыторыя БССР знаходзілася пад уплывам цёплых мас субтрапічнага паветра, якое насунулася на нашу тэрыторыю з паўднёвага захаду і дало павышэнне тэмпературы да +24+25 градусаў у паўночных раёнах рэспублікі і выпадзенне ападкаў з навальніцаю. 20-га красавіка з захаду ўваходзіць маса морскага палярнага паветра, што выклікала паніжэнне тэмпературы ў паўднёвых раёнах да +18+19 градусаў, а таксама па ўсёй тэрыторыі пахмурнасць і выпадзенне ападкаў, пераважна навальнічнага характару.

Харлап.

Метэаралагічная характарыстыка за 11—20 красавіка 1934 г.

З тэмпературнага боку гэта дэкада была надзвычайна няўстойлівая. Так, 11-га ў паўночнай зоне БССР сярэдняя сутачная тэмпература дасягала 0°, а ў паўднёвай 14°. У наступныя дні т-ра выраўніваецца за кошт таго, што значна паніжаецца на поўдні. 13-га яна хістаецца ад 0° да 4°. Далей, амаль да канца дэкады, наглядаецца паступовае павышэнне т-ры. 19-га сярэднія сутачныя тэмпературы хісталіся ад 11 да 17°. У апошні дзень у заходняй палове БССР т-ра знізілася на 4—6°.

Сярэднія дэкадныя т-ры хісталіся ад 5 да 10°, такім чынам былі на 1—2° вышэй нармальных.

Максімальная т-ра хісталася ад 17 да 25°, у большасці-ж была каля 22—24°. Мінімальная т-ра апускалася даволі нізка, да —1—4°.

Ападкі выпалі ў самых рознастайных колькасцях—ад 6 і да 35 мм. Малыя колькасці выпалі ў паўночна-заходняй частцы БССР у раёне Полацак—Плешчаніцы, мясцамі ў цэнтральнай частцы і амаль ва ўсёй паўднёвай зоне. Вялікія колькасці ападкаў, больш 30 мм, адзначылі: Мар'іна-Сосны (Любанскі р-н) і Касцюковічы.

Асабліва вялікія колькасці ападкаў выпалі 11-га, 19-га і 20-га. У астатнія дні амаль паўсюды ападкі выпадалі рэдка і ў малых колькасцях.

19-га і 20-га па ўсёй тэрыторыі БССР адзначаны грозы.

Вятры пераважалі паўночныя і паўночна-заходнія з сярэднімі хуткасцямі 2—4 м/сек.

Воблачнасць у большасці складала 60% агульнага пакрыцця неба.

Н. Малішэўская.

Сельска-гаспадарчая гідрамет. характарыстыка за 11—20 красавіка 1934 г.

Метэаралагічныя ўмовы справаздачнай дэкады з'яўляліся вельмі спрыяючымі для вытвару масавага севу зернавых культур, ільну і бульбы. Паўднёвыя метстанцыі адзначаюць паяўленне ўсходаў пшаніцы, аўсу і ячменю з ацэнкай „здавальняючыя“ і „добрыя“. Метстанцыя Зазер'е (Пухавіцкі р-н) адзначае „добрае“ становішча звышранніх пасеваў аўсу, ячменю і пшаніцы, якія знаходзяцца ў фазе трох лістоў.

Азімыя жыта і пшаніца, аднавіўшыя сваю вегетацыю пасля зімовага перыяда, знаходзяцца ў фазе кушчэння. Большасць метстанцый адзначаюць становішча іх на апошні дзень дэкады „добрае“.

В. Стэфановіч.

Вынікі асноўных назіранняў метэаралагічнай сеткі за сакавік м-ц 1934 года

У сакавіку м-цы маюцца спазненні з дасылкай назіранняў па наступным станцыям:

№№ п. ч.	Назва метстанцыі	Дата дасылкі матар. з метст.	Спазненне ў днях
1	Бабічы	7/IV	5
2	Орша МББ	8/IV	6
3	Магілеў ЛР	7/IV	5
4	Лельчыцы	6/IV	4
5	Крычаў	6/IV	4
6	Скрыгалава	20/IV	18

Матэрыял прабыў у дарозе 4-5 дзён, і ў Менск ён прыбыў 11—12 красавіка, а па дагаворанасці з дырэкцыямі чыгунак (Масква і Калуга) апрацаваны матэрыял павінен ім адсылацца 14-15 кожнага месяца. Такім чынам, Бабічы, Орша МББ, Магілеў, Лельчыцы, Крычаў і Скрыгалава ганебна зрываюць планавую працу аддзела метэаралогіі. Брудна і неахайна працуе Орша МББ, дасланая асноўная кніжка ўжо вельмі замазана (загадчык метэаралагічнай станцыі Пятроў). Не лепш працуе заг. мет. ст. Жлобін Дзепенчук. Адсутнічаюць вынікі паверкі гадзінніка ў асноўнай кніжцы па ст. Лельчыцы, Чэрыкаў, Турск, Крычаў, Менск. Па ст. Васілевічы загадчыкам Чайкоўскім ігнаруецца пастанова першага ўсебеларускага з'езда загадчыкаў: наглядальнікі не кантраліруюцца, у выніку чаго назіральнік Дакукін (новы) на працягу ўсяго месяца дае няправільны запіс па воблачнасці, прыклад 10/10 высока-слаістыя. Нікудышна працуе ст. Лельчыцы (заг. стан. Астапенка). Т. Астапенка да паступлення на курсы назіральнікаў скончыў рабфак, на курсах паспяховасць меў добрую і на Лельчыцкую мет. ст. быў камандырован з упэўненасцю, што працу там ён паставіць на належную вышыню, але т. Астапенка не апраўдаў тых сродкаў, якія дзяржава затраціла на яго адукацыю. Тав. Астапенка працай сабатуе. Запіс назіранняў вядзе не ў кніжцы, а на кавалках паперы, а потым дома пераносіць у кніжку і пры гэтым робіць шмат памылак, прыклад: 16-га і 17-га ў табліцы адзначаны працяглыя ападкі і колькасць ападкаў, а ў кніжцы гэта не адзначана. Нагляданні па прыладам утвараюцца недакладна: 15-га ў 21 гадзіну пралік на 10° па сухому т-ру (замест +6,2° дано +16,2°); 26-га ў 13 гадзін па т-рам даны *выдуманыя* адлікі. Ападкі заносяцца ў табліцу на дзень вымярэння; у графе: „Увага“ ёсць выпадкі, калі з'ява адзначана, але пачатак і канец яе не ўказваецца ні ў гадзінах ні ўмоўнымі значкамі. Па ст. Людвінава (заг. ст. Зайцаў) недакладныя адлікі па т-рам, прыклад: 7-га сакавіка ў 7 гадзін спірт паказваў —10,2, а ў 13 гадзін гэтага дня шчыфцік паказаў —6,5.

Нездавальняюча працуе станцыя Бабічы (заг. гідраметэаралагічнай ст. Булаўка), нагляданні загадчыкам не кантраліруюцца, няўмелыя нагляданні над ветрам (напрамак ветру ўказваецца пры штылю). Непісьменны запіс нагляданняў па воблачнасці— 10/10 высока-слаіста-кучавая—такой формы воблачнасці няма.

Даць тлумачэнне ў пісьмовай форме аб правільным вядзенні назіранняў па воблачнасці немагчыма, таму ўсім заг. мет. ст. II разр. уваходзіць у абавязак на тэх. занятках прапрацаваць спецыяльныя главы па воблачнасці па падручнікам: 1) „Курс метеорологии“ Бенуа і Никитин, стр. 274—297; 2) „Метеорологические приборы“ Колобкова, стр. 66—80 і поўнасцю прапрацаваць інструкцыю пад загалоўкам „Инструкция для производства специальных облачных наблюдений“ (издание ГГО 1932 г.).

Тэарэтычную прапрацоўку воблачнасці неабходна праверыць практыкай, ужываючы міжнародны атлас па воблачнасці, які на мет. ст. дасланы.

Усім назіральнікам патрэбна звярнуць увагу на падышоўшы від нагляданняў над навальніцамі і зарніцамі, для чаго патрэбна вывучыць інструкцыю. Пажадана, каб давалася кароткае апі-

санне паасобных гроз. Для прыкладу добрага апісання першай навальніцы, у гэтым годзе прыводзім апісанне загадчыка Гомельскай ст. тав. Паўлавай.

„17-га красавіка к 15 гадзінам праяснілася, але з поўдня на поўнач плылі паасобныя групы высока-кучавых, разорвана-кучавых і высока-слаістых воблакаў. К 16 гадзінам неба пачало зацягвацца высока-слаістымі воблакамі, якія паступова згушчаліся і пераходзілі ў дажджавыя. У 16 г. 30 мінут замарасіў дробны дождж, а ў 16 г. 50 м. да 17 г. 50 м. былі выразна відны ўспышкі бліскавіцы. Прамежак часу між бліскавіцай і наступаючым рокатам у наглядаемых выпадках быў не больш 12—20 секунд. Навальніца прышла з правага боку станцыі. Увесь час навальніцы ішоў сярэдні дождж і дзмуў паўднёвы вецер з хуткасцю 5 метраў у секунду. Воблачнасць была слаіста-дажджавой формы. У 17 г. 30 мін. навальніца прайшла. Ападкаў за час навальніцы выпала 5,5 мм. Дождж сярэдняй сілы працягваўся да 18 г. 15 мін.

А. Гурло.

ПАСТАНОВА

Бюро ЦК ЛКСМБ ад 27/IV 1934 г.

„Аб укамплектаванні 6-месячных курсаў назіральнікаў метэаралагічных станцый“ (Гольдман)

Улічваючы важнейшае гаспадарчае і абароннае значэнне работы Адзінай Гідраметрычнай Службы БССР і ўкамлектаванне яе перыферыі (метэаралагічныя станцыі II разрада) класава-вытрыманымі і праверанымі работнікамі, ЦК ЛКСМБ пастанаўляе:

1. Прапанаваць Райкомам ЛКСМБ пад асабістую адказнасць сакратароў выдзеліць на 6-месячныя курсы назіральнікаў метэаралагічных станцый згодна развёрсткі ЦК з комсамольцаў, маючых адукацыю не ніжэй сямігодкі, лепшых ударнікаў, калгаснікаў, рабочых соўгасаў і МТС.
2. Заявы і патрэбныя пры паступленні дакуманты з рэкамендацыяй ГК і РК ЛСМБ павінны быць накіраваны ў Галоўнае Кіраўніцтва Адзінай Гідраметслужбы да 15 мая 1934 г. гор. Менск, вул. Карла Маркса 48.
3. Развёрстку па раёнам зацвердзіць.

Умовы прыёма на 6-месячныя курсы

1. Вылучаныя кандыдатуры павінны мець адукацыю не ніжэй сямігодкі.
2. Жадаючыя паступіць на курсы незалежна ад пола падаюць заявы па адрасу: Менск, Карла Маркса 48, Кіраўніцтва Адзінай Гідраметслужбы БССР, т. Бугаеву, з прыложанымі дакумантамі:
   а) даведку аб соц. і матэрыяльным становішчы бацькоў да 1917 году,
   б) анкету, завераную сельсоветам (Горсоветам),
   в) водзыў па месцу работы.

3. Таварышам, залічаным слухачамі курсаў, аб пачатку заняткаў будзе паведамлена дадаткова.

4. Курсанты забяспечваюцца: сталовай, інтэрнатам і стыпендыяй па паспяховасці.

5. Паспяхова скончыўшы курсы, атрымоўваюць спецыяльнасць назіральніка метэаралагічнай станцыі.

6. На назіральніка метэаралагічнай станцыі II разрада ўскладаюцца абавязкі: вытвараць назіранні над становішчам надвор'я, апрацоўку гэтых назіранняў і догляд за інструментарыем метпляцоўкі.

7. Пры накапленні практычнага стажу, а гэта значыць і падвышэнні кваліфікацыі назіральнік можа быць вылучан на пасаду загадчыка метстанцыяй.

8. Прыём заяў да 15 мая г. г.

Параённая развёрстка на членаў ЛКСМБ для ўкамплектавання 6-месячных курсаў Адзінай Гідраметслужбы БССР

№№ п. ч.	Назва раёну	Метстанцыя	Развёрстка
1	Барысаўскі	Барысаў	2 чал.
2	Горацкі	Горкі	1 "
3	Мазырскі	Калінкавічы	1 "
4	Асіпавіцкі	Асіпавічы	1 "
5	Аршанскі	Орша, Асінторф	2 "
6	Віцебскі	Віцебск	3 "
7	Рэчыцкі	Васілевічы, Бабічы	1 "
8	Гомельскі	Гомель	3 "
9	Жлобінскі	Жлобін	1 "
10	Жыткавіцкі	Жыткавічы	1 "
11	Крычаўскі	Крычаў	1 "
12	Менскі	Менск	3 "
13	Пухавіцкі	М.-Горка, Зазер'е	1 "
14	Магілеўскі	Магілеў	2 "
15	Полацкі	Полацак	2 "
16	Слуцкі	Слуцак	1 "
17	Гарадоцкі	Бычыха	1 "
18	Лепельскі	Лепель	1 "
19	Лельчыцкі	Лельчыцы	1 "
20	Сіроцінскі	Сіроціна	1 "
21	Дрысенскі	Дрыса	1 "
		Стукачова	
22	Камарынскі	Людвінава	1 "
23	Любанскі	М.-Сосны	1 "
24	Дзержынскі	Негарэлае	1 "
25	Лёзнянскі	Н.-Каралёва	1 "
26	Петрыкаўскі	Петрыкаў, Скрыгалава	2 "
27	Рагачоўскі	Турск	1 "
28	Чэрыкаўскі	Чэрыкаў	1 "
29	Ушацкі	Баркаўшчына	1 "

Адказны рэдактар П. Мамаеў.

Члены рэдкалегіі: Ф. Рабаконь, А. Кайгарадаў, Б. Лісіцкі, І. Калько, І. Рачыцкі.

Друкарня БелАН. Зак. № 160. Гарліт № 2892. Тыраж 600 экз. 9 стар.

Москва
Софийская Набережная
№ 38
Гидрометеорологическая
станция ЦБК.

МЕНСК · МИНСК · 19.6.34

МОСКВА · 20.6.1934 · 704

МОСКВА · 20.6.34.21 · …НИЧСКИЙ

Согласно пост. НКП …

2172